# Сёння, 14 лютага, Мінсувязі выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «100-годдзе ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь»

14 лютага 2018 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «100-годдзе ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь».

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Галоўным кіраваннем камандуючага ўнутранымі войскамі МУС Рэспублікі Беларусь.

У аснове маркі і спецштэмпеля - эмблема ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь, на канверце «Першы дзень» - памятны знак да 100-годдзя ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь.

Дызайн маркі, спецштэмпеля і канверта «Першы дзень» Таццяны Кавалёвай. Памер маркі 28x30 мм. У лісце восем марак і адзін купон. Памер ліста 105x112 мм. Пры вырабе маркі, на купоне і марачным полі выкарыстаная тэхналогія тэрмічнага ціснення матавай фальгой залацістага колеру. Наклад маркі 40 тысяч.

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (крама «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

*Днём утварэння ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь лічыцца 8 сакавіка 1918 году, калі ў Віцебску была створана канвойная каманда з ліку добраахвотнікаў у колькасці 23 чалавек.*
*Сучасныя ўнутраныя войскі МУС Рэспублікі Беларусь - зладжаная высокамабільная ваенная арганізацыя, якая гарантуе стабільнасць у грамадстве, абарону жыцця і здароўя грамадзян.*
*Займаючы адно з ключавых месцаў у сістэме забеспячэння нацыянальнай бяспекі, унутраныя войскі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь штодзённымі канкрэтнымі справамі даказваюць вернасць свайму народу.*

Падрабязней на сайце РУП «Белпошта»

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/14-02-2018-2754*